# ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ ГОСУДАРСТВА И ПРАВА

**УДК 340.12**

## ВЫКЛАДАННЕ ЮРЫДЫЧНЫХ НАВУКАЎ У ЕЗУІЦКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ НА ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

***канд. юрыд. навук Д.В. ШЧЭРБІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца гісторыя заснавання і дзейнасці езуіцкіх навучальных установаў на Полацкай зямлі, пачынаючы ад іх узнікнення ў Рэчы Паспалітай у часы Стэфана Баторыя ў XVI стагоддзі і сканчваючы іх ліквідацыяй у Расійскай Імперыі падчас уладарання Аляксандра I у XIX стагоддзі. Гісторыя «Таварыства Езуса» разглядаецца праз прызму выкладання юрыдычных навукаў: падаюцца канспекты лекцый юрыдычных і сумежных дысцыплінаў у Полацкім езуіцкім калегіуме, а потым і Полацкай езуіцкай Акадэміі, пералічваюцца выкладчыкі-спецыялісты ў праве, узгадваюцца падручнікі па юрыдычным прадметам, метады выкладання палітычных і праўных ведаў. У артыкуле падводзяцца вынікі дзейнасці Акадэміі: колькасць студэнтаў, што вывучалі права, лічба асобаў, якім былі прысуджаны акадэмічныя ступені дактароў у сферы права.*

Нягледзячы на шматлікія працы прысвечаныя дзейнасці езуітаў на тэрыторыях, што адносіліся да Рэчы Паспалітай, у тым ліку Беларусі [3, с. 5 – 24], яны ўсе, і крытычныя і апалагетычныя, разглядаюць пытанні або гісторыі з'яўлення і ліквідацыі на дадзенай тэрыторыі «Таварыства Езуса», іх уплывам на палітыку, або пытанням адкрыцця іх навучальных установаў і асаблівасцям іх педагагічных прыёмаў. Ня шмат, аднак, працаў, якія прысвечаныя асаблівасцям выкладання езуітамі юрыдычных дысцыплінаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, што і з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула.

**Асноўная частка.** Дваццаць сёмага верасня 1540 года Папа Павел III асобнай булай «Regimini militantis Ecclesiae» заснаваў «Таварыства Езуса» (лат. Societas Jesu). Булай была зацверджана Formula Instituti, якую ў 1550 годзе 21 чэрвеня яшчэ раз пацвердзіў Папа Юлій III булай «Exposcit debitum». У Формуле адным з сродкаў дасягнення мэтаў ордэна было абвешчана стварэнне навучальных установаў: «уяўляецца вельмі дарэчным, каб з юнакоў, схільных да пабожнасці і здольных да заняткаў навукамі, рыхтавалі работнікаў для таго ж вінаградніка Гасподняга, якія складалі б для нашага Таварыства, у тым ліку і для професаў (сябры ордэна, якія прынялі апошнія шлюбы – *ад аўт.*), нешта накшталт сядзібы. Таму дзеля зручнасці дзейнасці Таварыства професаў можа мець калегіі схаластыкі ўсюды, дзе набожнасць падштурхне каго-небудзь на іх збудаванне і забеспячэнне сродкамі» [7].

Вельмі хутка калегіумы езуітаў распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе. Першы з іх быў заснаваны ў 1548 годзе ў Месіне, другі – у 1551 годзе ў Рыме. І ўжо праз дваццаць год, у верасні 1569 года, аўстрыйскі правінцыял накіраваў у Вільню першых езуітаў, якія з кастрычніка месяца пачалі выкладанне. Афіцыйна ж віленскі калегіум быў заснаваны 15 жніўня 1570 года.

Кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторы 7 ліпеня 1578 года выдаў прывілей на пераўтварэнне Віленскага калегіума ў акадэмію з усімі правамі еўрапейскіх універсітэтаў: студэнты вызваляліся ад мыта і падпарадкавання свецкім уладам, а навуковыя ступені, здабытыя ў ёй, мелі такую ж вартасць і тыя ж прэрагатывы, як і ў выпускнікоў, напрыклад, Кракаўскага ўніверсітэта. Праз год прывілей уступіў у законную сілу, а ўжо 30 кастрычніка 1579 года ён быў канчаткова пацверджаны булай Папы Грыгорыя XIII.

Вельмі хутка пасля стварэння Віленскай езуіцкай акадэміі пачалі засноўвацца калегіумы ў іншых гарадах Вялікага княства Літоўскага. Пасля вызвалення ў канцы жніўня 1579 года Полацкага замка ад маскоўскага войска, 30 верасня кароль Стэфан Баторы запрашае віленскіх езуітаў да заснавання навучальнай установы ў горадзе, «калегіўма, якому пазайздросцяць гіспанскія і партугальскія езуіты» [10, с. 16]. І ўжо летам 1580 года калегіум быў адчынены. Першая калонія езуітаў складалася з айца Пятра Скаргі (рэктар), айца Станіслава Ленчыцкага і айца Яна Аланда [9, с. 12]. На пачатку з-за непрыхільнасці мясцовых праваслаўных і пратэстанцкіх магнатаў колькасць вучняў была 5 чалавек, але ўжо ў 1590 годзе навучэнцаў апошняга класа гімназіі было 60, а навучэнцаў ніжэйшых класаў нават дзялілі на 5 групаў [9, с. 12].

Для езуіцкіх навучальных установаў былі характэрныя ўніфікаваная структура і арганізацыя навучальнага працэсу. Як і ў Заходняй Еўропе, яна рэгламентавалася «Спосабам і ладам навучання» («Ratio atque institution studiorum»). У адпаведнасці з ім поўны езуіцкі калегіум уключаў тры ступені: пяці-, шасцікласны курс гімназіі, які заканчваўся класам рыторыкі; трохгадовы курс філасофіі, даступны як для сябраў ордэна, так і для свецкіх асобаў, і чатырохгадовы курс тэалогіі – толькі для кандыдатаў у духоўны сан.

Полацкі калегіум уключаў курсы філасофіі і тэалогіі, адпаведна лічыўся калегіумам вышэйшага тыпу (studia superiora). Юрыдычныя навукі ў калегіуме пачыналі выкладацца толькі на ўзроўні класа тэалогіі – кананічнае права, аднак з палітычнымі і юрыдызаванымі тэкстамі студэнты сустракаліся і раней, бо выкладанне нават у гімназічных класах граматыкі, паэтыкі, рыторыкі вялося з выкарыстаннем тэкстаў Платона, Дэмасфена, Цэзара, Сенэкі, Тацыта і асабліва Цыцэрона. Да таго ж падручнікі па некаторым навукам (напрыклад, гісторыі і геаграфіі) змяшчалі сапраўды энцыклапедычныя веды, у тым ліку і прысвечаныя дзяржаўнаму ладу як сваёй краіны, так і замежных. Так, напрыклад, выкарыстоўваўся падручнік па гісторыі і геаграфіі Яна Бельскага (1763 г.), ва ўводзінах да якога сам аўтар указваў, што ён быў прысвечаны «гісторыі Польшчы, назве, гербу, падзелу краіны, пашырэнню земляў, заваёве новых ці страце старых, кіраванню Польшчай, парадку і зменам у тым кіраванне. Далей распявалася пра польскіх каралёў, як увогуле, так і асобна, пра ўчыненае імі, пра правы і ўладу караля, каралевы, іх нашчадкаў. Затым пра стан Рэчы Паспалітай, а менавіта: пра Сенат і рыцарства, урады каронныя і літоўскія, ваяводскія, земскія і гарадоў... У заканчэнні пра паспалітыя сеймікі і Сеймы…, казну, Трыбунал, суды ... у двух тамах і чатырох кнігах выкладацца будзе» [8].

У той жа час пра ранейшыя перыяды звестак засталося няшмат, выкарыстоўваліся і іншыя падручнікі па дадзеным дысцыплінам. Так, паводле сведчання Т.Б. Бліновай, найбольшай папулярнасцю ў школах «Таварыства Езуса» карысталіся творы Кароля Вырвіча, які ў супольнасці з іншымі аўтарамі «Палітычная гісторыя старажытных дзяржаў» (1772 г.) прыводзіў урыўкі з кнігі Ш. Мантэскье «Пра дух законаў» [3, с. 104].

Да таго ж у другой палове XVIII стагоддзя езуіты пачалі выкарыстоўваць наватарскі метад практычнага засвойвання ведаў, які быў звязаны з палітычнай практыкай тых часоў. Параліч цэнтральных органаў улады ў гэты перыяд прывёў да актыўнасці мясцовых прадстаўнічых органаў, таму было натуральна выкарыстоўваць набыўшы ў тыя часы важкасць палітычны інстытут сейміка для навучальнага працэсу. Сеймікі ў калегіумах ладзіліся выключна па пытаннях палітыкі, яны арганізацыйна дублявалі рэальныя ўстановы з іх маршалкамі, рэгламентамі, галасаваннем і «liberum veto». Дадзеная форма диспуту рыхтавала шляхецкую моладзь да ўдзелу ў палітычным жыцці краіны [3, с. 44 – 45]. У якасці самастойнай падрыхтоўкі перад публічным выступам пісаліся навуковыя пісьмовыя працы – паўсеймікі.

Езуіты выкарыстоўвалі свой педагагічны аўтарытэт, каб праз сваіх выхаванцаў аказваць уплыў на бягучую палітыку краіны. Так, 25 красавіка 1753 года правінцыял Станіслаў Попел у лісце да кіраўнікоў езуіцкіх установаў афіцыйна пісаў пра неабходнасць правядзення рэформаў у Рэчы Паспалітай. У ім настойліва рэкамендавалася арганізоўваць дыспуты, прымяркоўваючы іх да збораў шляхты на паседжанні трыбунала і сеймікаў. Пры гэтым указвалася, каб езуіцкія выхаванцы, выкарыстоўваючы атрыманыя веды па літаратуры, гісторыі і іншым гуманітарным дысцыплінам, пад кіраўніцтвам прафесараў рыхтавалі тэксты прамоваў для выступаў. Паміж тым на першы план павінна было высоўвацца патрабаванне правядзення неадкладных мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне дзяржавы. Правінцыял лічыў, што арганізацыя падобных сеймікаў будзе карысная не толькі юнацтву, але і прысутнай на іх шляхце [3, с. 111].

Нягледзячы на часам неспрыяльныя ўмовы, выкліканыя працяглымі войнамі і разбурэннямі XVII – XVIII стагоддзяў, Полацкі езуіцкі калегіум працягваў сваю дзейнасць з невялікімі перапынкамі. Не перашкодзілі яго педагагічнай дзейнасці ні падзелы Рэчы Паспалітай, ні забарона ў 1773 годзе Папай Клімянтам XVI «Таварыства Езуса». Менавіта апошняя падзея прывяла ў Полацк найбольш вядомых езуіцкіх прафесараў [1, с. 331].

Царскія ўлады напачатку ставіліся да езуітаў прыхільна, якія павінны былі адыграць не апошнюю ролю ў геапалітычных планах Расійскай імперыі – спачатку жадалі выкарыстаць іх знаёмства з Усходам для распаўсюджвання расійскага ўплыву на Кітай, потым, пасля парушэння рэлігійных правоў у Еўропе, Пецярбург спрабаваў стаць хрысціянскай сталіцай усяго кантынента [6].

Дваццаць чацвёртага жніўня 1810 года, за чатыры гады да афіцыйнай рэабілітацыі ордэна Папай Піем VII, генерал легальных толькі ў Расійскай імперыі езуітаў Т. Бжазоўскі падае міністру асветы імперыі А.К. Разумоўскаму першую просьбу аб адкрыцці Полацкай езуіцкай Акадэміі. Хадайніцтва аб адкрыцці ўніверсітэта падала і беларуская шляхта, яе падтрымаў генерал-губернатар Белай Русі князь А. Віртэмбергскі. Ідэю падтрымаў і вельмі ўплывовы ў тыя часы пры расійскім двары пасол каралеўства Сардзініі вядомы

контррэвалюцыйны мысліцель Жазэф дэ Мэстр [5]. У пяці лістах да А.К. Разумоўскага і падчас асабістай сустрэчы з імператарам Аляксандрам I ён распавёў аб сістэме выкладання ў езуіцкіх навучальных установах, адмёў усе прэтэнзіі, што вылучаліся ў дачыненні да ордэна, і як адну з найважнейшых прычынаў, што выклікала стварэнне акадэміі, высунуў ідэю аб актыўным выкарыстанні езуітаў супраць дэструктыўных ілюмінацкіх і іншых рэвалюцыйных «сектаў», якія пагражалі небяспекай грамадскаму і палітычнаму ладу Расіі і ў той жа час ідэйна варагавалі з ордэнам [9, с. 42].

Пасля ўсіх неабходных працэдураў афіцыйны рапарт Т. Бжазоўскага быў заслуханы на паседжанні камітэта міністраў Расіі, пасля чаго 12 студзеня 1812 года Аляксандрам I быў падпісаны Указ аб утварэнні акадэміі: «Во уважение представленного Нам желания Белорусского дворянства и пользы для наук от соревнования между несколькими училищами равной степени, признали Мы за полезное возвести Полоцкую иезуитскую коллегию на степень Академии, с присвоением ей преимуществ, дарованных университетам» [1, с. 336; 9, с. 57 – 58]. У дадзеным указе між іншага адзначалася, што ў акадэміі будуць вывучацца толькі навукі, узгодненыя з урадам, акрамя медыцыны і крымінальнага права.

Указам ад 1 сакавіка 1812 года была зацверджана Грамата Полацкай езуіцкай Акадэміі. Паводле артыкула 2 Граматы ў Акадэміі ствараліся тры факультэты: філалагічны, факультэт вольных навукаў, філасофіі і іншых натуральных і грамадскіх навук і тэалагічны факультэт. У межах факультэта вольных навук сярод іншых прадугледжвалася выкладанне натуральнага права, прыватнага і рымскага цывільнага права; на тэалагічным факультэце – кананічнага права [9, с. 59]. Артыкул 23 Граматы прадстаўляў Акадэміі права прысвойваць і ступені дактароў грамадзянскага і кананічнага права [9, с. 23].

Палажэнні ўказа раскрываліся ў «Уставе або агульных пастанаўленнях Полацкай езуіцкай Акадэміі», дзе між іншага пералічваліся абавязкі студэнтаў. Так, напрыклад, ім забаранялася «хадзіць у староннія тэатры, на відовішчы, на месцы, вызначаныя для пакарання смерцю публічных злачынцаў, таксама начныя зборы, паляванне, утрыманне паляўнічых сабак або птушак; напрыканцы, гульні ў карты, асабліва на грошы, зусім студэнтам забараняюцца» [3, с. 156].

З-за вайны з Напалеонам педагагічная дзейнасць у Полацкай езуіцкай Акадэміі распачалася толькі з восені 1813 года; да вучобы прыступілі толькі 84 студэнты: на факультэце тэалагічным – 25, на філасофскім – 29, філалагічным – 30. У навучальным 1814 – 1815 годзе лічба студэнтаў трохі вырасла: 25 тэолагаў, 66 філосафаў і знаўцаў вольных навукаў і 45 філолагаў. Таксама вядома, што ў 1818 годзе ўсяго было 529 студэнтаў, а перад закрыццём Акадэміі іх лічба даходзіла да 700 [9, с. 65].

Якія ж юрыдычныя навукі выкладаліся ў Акадэміі. Звесткі пра гэта мы знаходзім ў «Зборы навукаў у Полацкай Акадэміі Таварыства Езуса», каторы штогод перавыдаваўся ў акадэмічнай тыпаграфіі. Так, у навучальным 1814 – 1815 годзе на факультэце тэалогіі ў межах курсу па дагматычнай тэалогіі, які чыталі ксёндз Міхал Ляснеўскі (доктар тэалогіі і царкоўнага права, дэкан філасофскага факультэта) і ксёндз Францішак Дзеражынскі, студэнты даведваліся пра крыніцы касцёльнага права, яго паходжання ад Хрыста, аб сутнасці і працэдурах сакраманта пакаяння, аб сутнасці і форме сакраманту сужэнства, аб вынікаючай з Новага Запавету яго непарушнасці, аб забароне шматжонства, аб праве Касцёла вызначаць перашкоды да заключэння сакраманту шлюбу для вернікаў, іх змесце [9, с. 69 – 71]. У Зборы за навучальны 1818 – 1819 год дадзеную дысцыпліну выкладалі той жа ксёндз Ф. Дзеражынскі і ксёндз Ян Разавен, доктар і прафесар тэалогіі. Ксёндз Ф. Дзеражынскі адзначаў, што правамоцтвы па ўстанаўленні законаў і вяршэнні правасуддзя атрымлівае ад Хрыста Папа Рымскі разам з Саборам або без яго ў еднасці з пастырамі і біскупамі. Адпаведна, Касцёл мае права ўстанаўліваць права кананічнае, катораму ўсе павінны падлягаць, а тых, хто не выконвае яго, пакараннямі настаўляць або ад грамадства аддаляць; адзначаў таксама, што духоўныя асобы маюць права валодаць маёмасцю і займаць легальна набытыя палітычныя пасады. Ксёндз Ян Разавен у сваю чаргу больш разглядаў не сакрамант сужэнства, а сакраманты эўхарыстыі, намашчэння хворых і святарства [9, с. 87 – 89].

Кананічнае права ў 1814 – 1815 гадах чытаў дэкан факультэта моў і літаратуры, доктар тэалогіі і кананічнага права, прафесар кананічнага права Дэзідэрый Рыхардот. У межах яго курса выкладалася судовае кананічнае права. Пачынаў ён з вызначэння кола асобаў, што могуць распачынаць судовае справаводства, аб судовых выдатках, аб рэквізітах скаргі, аб фармальнасцях з азнаямленнем адказчыка, пра доказы і іх абвяржэнне, аб прысязе і г.д.; так як бакі спрэчкі звычайна просяць аб дадатковым часе для падрыхтоўкі скаргі або для яе абвяржэння, то ўказваў, якія і ў якіх выпадках такія затрымкі могуць быць дазволеныя; якія дні з’яўляюцца выхаднымі ў судзе; аб парадку азнаямлення і спосабе вядзення справы. Потым тлумачыў аб арэндзе, аб праве на вяртанне пазычанай рэчы, аб карах за няяўку ў суд і інш.; высвятляў, якое значэнне мае прызнанне вінаватага, яго саўдзельнікаў і інш.; якія павінны быць доказы, паказанні сведкаў, як яны павінны дапытвацца і г.д.; тлумачыў палажэнні аб прысязе, аб даўнасці па духовых справах, аб вызваленні ад судовага пакарання, аб прысудзе, яго выкананні і аб апеляцыях [9, с. 71 – 72].

У 1818 – 1819 гадах ксёндз Антоні Каллабота, прафесар кананічнага права і гісторыі касцёла, выкладаў дадзеную дысцыпліну некалькі з іншых пазіцый. Асноўную ўвагу ён прысвячаў абавязкам і павіннасцям клерыкаў, а таксама тым відам адказнасці, што з парушэння гэтых абавязкаў вынікаюць, у тым ліку і тых, што адносяцца да касцёльнага суду [9, с. 90].

На факультэце вольных навукаў і філасофіі юрыдычныя веды студэнты пачыналі атрымліваць у першым класе ў межах такіх дысцыплінаў, як «Этыка або маральная філасофія» і «Палітычная эканоміка і статыстыка», якія чытаў ксёндз Самуэль Рагоза, прафесар этыкі, палітычнай эканомікі, статыстыкі і залогіі. У межах першай дысцыпліны ён звязваў мэту існавання чалавека з жыццём паводле Божага Провіду, што абапіраецца на ўладу вечнага і дасканалага Бога. З гэтага пастулату вынікала тэалагічная канцэпцыя права, якая адпаведна з тамістычнай традыцыяй вылучала наступныя віды законаў. Перш за ўсе гэта натуральнае права, якое створана Богам, якому ўсё без выключэнняў падпарадкаванае і якое ў дастатковай меры чалавеку адкрытае праз святло розуму. У адрозненне ад боскага натуральнага права, права народаў бярэ свой пачатак у ўсеагульнай згодзе людзей і мае сваёй мэтай забеспячэнне іх выключна зямных інтарэсаў. Але Бог даў людзям яшчэ і пісанае Боскае права, як у выглядзе Старога Запавету, які быў нададзены габрэйскаму народу, так і ў выглядзе Новага Запавету, то бок удасканаленага боскага закону, што прызначаны для ўсяго чалавецтва. Кананічнае ж права прымаецца Касцёлам па праву, нададзенаму Хрыстом. Абавязкі ж чалавека, вучыў згодна з касцёльнай традыцыяй Рагоза, датычаць Бога, сябе самога і бліжніх і вынікаюць з веры [9, с. 83].

У межах палітычнай эканоміі і статыстыкі акрамя іншага студэнты атрымлівалі веды пра розныя формы кіравання, іх сутнасці і межы. Прафесар даводзіў, завочна палемізуючы з радыкальнымі прыхільнікамі асветніцкіх рацыяналістычных ідэй, што ні для адной формы кіравання рэлігія не з'яўляецца перашкодай, наадварот, калі яна цесна з імі звязаная, то толькі ўмацоўвае іх.

Касцельны ўрад не з'яўляецца канкурэнтам свецкага кіравання, ён мае зусім іншую сутнасць і прыроду, яны не перашкаджаюць адзін аднаму, маюць розныя мэты і ўласцівыя размежаваныя сферы рэгулявання. Пры гэтым аўтар курсу адзначаў, што якраз свабода для атэістаў прыносіць шкоду любому свецкаму ўраду, раз'ядае ўсе яго часткі [9, с. 84].

У чацвёртым класе факультэта вольных навук выкладаўся курс па грамадзянскаму праву і дыпламатыі, які чытаў ксёндз Клеменс Пятроўскі, прафесар грамадзянскага права і дыпламатыі. Пачынаў свой курс з паўтарэння ведаў аб натуральным і дзяржаўным праве, якія студэнты атрымалі з курса этыкі. Потым ён пераходзіў да выкладання рымскага і расійскага грамадзянскага права, дыпламатыю ж закранаў у тых выпадках, калі разважаў пра дзяржаўныя дакументы.

Распачынаўся курс з разважанняў аб вылучэнні відаў права. Узгадваў вядомы студэнтам з этыкі падзел права на прыроджанае права і права дзяржаў (народаў), потым тлумачыў першыя два артыкулы Інстытуцый Юстыніяна аб падзеле права народаў на права ўнутрыдзяржаўнае і міжнароднае, якое вынікае з натуральнага розуму і аднолькава абароненае ва ўсіх народаў, і пра крыніцы дзяржаўнага права. Потым прафесар тлумачыў другі артыкул першай кнігі Пандэктаў пра падзел права на публічнае і прыватнае, што складаецца з палажэнняў натуральнага, міжнароднага і грамадзянскага права. Гэтыя артыкулы, на яго думку, як бы закладалі падмурак для рымскага грамадзянскага права, былі яго пачаткам [9, с. 76].

Далей у межах дысцыпліны выкладаліся некаторыя агульныя правілы, што датычыліся асобаў і рэчаў у агульным сэнсе, потым ішло выкладанне гісторыі рымскага права, і нарэшце прафесар прыступаў да выкладання збору права Юстыніяна, выбіраючы найважнейшыя палажэнні, што не страцілі актуальнасці ў часы Полацкай Акадэміі.

Выкладанне рымскага грамадзянскага права будавалася паводле класічнай інстытуцыйнай сістэмы. Спачатку ішлі лекцыі, якія датычыліся прававога статусу асобы. Аўтар курсу выкладаў палажэнні аб абавязках розных катэгорый насельніцтва: вольных, вызваленых і слугаў; пералічваў абавязкі асобаў, што знаходзіліся ў шлюбе, як паміж сужонкамі, так і паміж бацькамі і дзецьмі; аб межах і тэрмінах бацькоўскай улады над дзецьмі; аб сутнасці і ўстанаўленні апекі, патрабаванняў да апекуноў, іх правамоцтвах і абавязках, аб асобах, якім прызначаюць апекуноў, і нарэшце аб злоўжываннях апошніх [9, с. 76].

Наступны інстытут, які разглядаў прафесар Пятроўскі, быў інстытут рэчаў. На лекцыях выкладаліся веды пра віды рэчаў, пра спосабы набыцця маёмасці, як прыроджаныя: авалоданне, завалоданне, знаходка, так і грамадзянскія: даўнасць, дарэнне і спадчына. Лектар указваў, што як раз з апошняй шмат цяжкасцяў і спрэчак вынікае. У дачыненні да яе ў межах курсу даваліся веды аб перадачы спадчыны па закону і па завяшчанні, аб розных відах завяшчанняў і іх юрыдычнай важкасці і інш. [9, с. 76].

Праз раскрыццё выпадкаў далучэння да завяшчанняў умоваў аб дарэнні маёмасці прафесар К. Пятроўскі пераходзіў да важнасці дамоваў, формаў кантрактаў, умоваў іх абавязковасці. Асаблівую ўвагу ён

надаваў дамовам абмену, займу, залогу рухомых і нерухомых рэчаў і інш. Напрыканцы спыняўся на пытаннях абавязкаў, вынікаючых з дамоваў.

Наступны раздзел курсу быў прысвечаны правапарушэнням. Спачатку прафесар К. Пятроўскі распавядаў агульныя характарыстыкі злачынстваў, спыняўся на іх шматлікіх відах, у тым ліку спецыяльна надаваў увагу парушэнням, накіраваным супраць Бога, урада, агульнага дабра, а заканчваў разглядам відаў пакаранняў, якія выкарыстоўваліся ў старажытным Рыме [9, с. 77].

Апошняя частка курсу была прысвечана правасуддзю. Праграма датычылася асноўных палажэнняў правасуддзя, іх асноўных відаў, важнейшых спосабаў дасягнення справядлівасці (дазнання), розных пытанняў, датычных як грамадзянскага, так і крымінальнага працэсу. Асаблівая ўвага звярталася на абавязкі суддзяў [9, с. 77].

Вывучэнне расійскага права ішло ва ўзаемасувязі з правам рымскім. Прафесар спачатку апавядаў пра палажэнні рымскага права, а потым каментаваў іх у адпаведнаці з правам расійскім.

Полацкая Акадэмія магла пахваліцца дасягненнямі сваіх студэнтаў. Гэта адлюстроўвае ў сваёй манаграфіі Т. Блінова, якая прыводзіць сведчанне, што з верасня 1814 года па верасень 1819 года 17 чалавек атрымалі ступені дактароў тэалогіі і кананічнага права, 43 – ступені дактароў грамадзянскага права [3, с. 179].

Дактарам выдаваўся дыплом, дзе ад імя рэктара і акадэмічнага савета абвяшчалася аб тым, што ўладар дыплома вывучыў адпаведныя спецыяльнасці курсы і паказаў свае веды на акадэмічным іспыце, за што яму прысвойваецца навуковая ступень з правам карыстацца ўсімі прывілеямі, якія нададзены ўладальнікам дадзенага звання.

Актыўнасць езуітаў прыносіла плён ордэну. Каталіцкая вера пашыралася, у тым ліку і за кошт грэка-католікаў і праваслаўных. Сярод неафітаў ордэна ў Расійскай імперыі былі нават пляменнік міністра асветы князя А.М. Галіцына, сын члена Дзяржаўнага савета, князь І. Гагарын і інш. [1, с. 342]. У выніку ў праваслаўных праўрадавых колах расла незадаволенасць ордэнам.

У 1815 годзе сябраў «Таварыства Езуса» выслалі з Пецярбурга ў Полацк, з 1817 года ў Акадэмію забаронена прымаць асобаў, што не адносяцца да рыма-каталіцкага веравызнання. І нарэшце, 13 сакавіка 1820 года міністр духоўных спраў і народнай асветы князь А.М. Галіцын падрыхтаваў даклад, у якім езуітаў абвінавачвалі ў празелітызме, што яны «действуют среди государства благоустроенного, как в стране, светом христианским неозаренной» [2, с. 114]. У дакладзе прадугледжвалася «1. Иезуитов как забывших священный долг не только благодарности, но и подданнической присяги и потому недостойных пользоваться покровительством российских законов выслать под присмотром полиции за пределы государства и впредь ни под каким видом и наименованием не впускать в Россию. 2. Полоцкую иезуицкую Академию и подведомственные ей училища упразднить…» [2, с. 115]. Імператар Аляксандр I у той жа дзень зацвердзіў даклад, і да чэрвеня 1820 года езуіты пакінулі Расію.

У 1822 годзе на базе былой Акадэміі ў Полацку адкрылася школа іншага каталіцкага ордэна Піяраў. І хоць дадзеная школа выходзіла па сваіх праграмах за межы гімназічнага курсу [1, с. 346], гэта была ўжо не вышэйшая навучальная ўстанова. А з 1830 года будынкі былой акадэміі былі перададзеныя кадэцкаму корпусу.

**Высновы:**

- за сваю не вельмі працяглую гісторыю Полацкая езуіцкая Акадэмія *распачала традыцыю вышэйшай юрыдычнай адукацыі на землях Прыдзвіння*;
- *спрычынілася да пашырэння юрыдычных ведаў*;
- *зрабіла значны ўнёсак у педагагічную навуку Беларусі.*

ЛІТАРАТУРА


1. Арлоў, У. Таямніцы Полацкай гісторыі / У. Арлоў. – Мінск: Полымя, 2000. – 464 с.
2. Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси: издаваемый при Управлении Виленского учебного округа / сост. П.А. Гильтебрандт, Ф.Г. Елеонский, А.Л. Миротворцев. – Вильна: Печ. Губ. правления, 1867 – 1904. – Т. 5 (доп.) / Изд. О. Щербицким и А. Демьяновичем, 1871. – XVI, 256, 136 с. // Онлайн библ. Царского села [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://book-old.ru//BookLibrary/04300-Sbornik-Severozapadnoy-Rusi/1871.-Arheograficheskiy-sbornik-dokumentov-...-Severozapadnoy--Rusi.-Tom-5-dopolnitelnyiy.html. – Дата доступа: 15.02.12.
3. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т.Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с.

4. Жлутко, А. Езуіты на Беларусі: пошукі праўды / А. Жлутка // Гістарычны клуб імя В. Ластоўскага [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://polotsk-history.iatp.by/lastow/bibl/ezuit.rar. – Дата доступа: 15.02.2012.
5. Катлярчук, А. Жазэф дэ Мэстр і Тадэвуш Бжастоўскі ў справе адкрыцця Полацкай езуіцкай Акадэміі / А. Катлярчук // Камунікат. Беларуская інтэрнэт-бібліятэка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/sbornik/01/15_katlarczuk.htm. – Дата доступа: 15.02.2012.
6. Серабракоў, З. Філязофія Акадэміі езуітаў у Полацку / З. Серабракоў // Фрагменты. – 2000. – № 3 – 4. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://old.knihi.com/frahmenty/9serabrakow.htm. – Дата доступа: 15.02.2012.
7. Формулы Института Общества Иисуса, одобренные и утверждённые Верховными Понтификами Павлом III и Юлием III // Общество Иисуса в России и СНГ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.jesuit.ru/files/formulae.pdf. – Дата доступа: 15.02.2012.
8. Bielski, J. Widok Królestwa Polskiego ze wszystkiemi woiewodztwami, xięstwy y ziemiami, monarchami y monarchiniami, iako też monarchow tychże y monarchin prawami, Rzeczypospolitey stanami y tychże stanow urzędami y uroczystemi Seymikow, Seymu, Senatu rad [...]. W krotkim [...] opisie, rodowitym ięzykiem polskim szkolney polskiey szlachetney młodzi wystawiony / J. Bielski. – Tom I. [Księga I]. – Poznań, 1763 // Silesian Digital Library [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.sbc.org.pl/dlibra/ /docmetadata?id=14678&from=&dirids=1&ver_id=&lp=4&QI=FE453B00C4297EA24F85CEA427558DFC-6. – Дата доступа: 15.02.2012.
9. Giżycki, J.M. Materyały do dziejów Akademii Połockiej i szkół od niej zależnych / J.M. Giżycki. – Kraków: W.L. Anczyc i Spółka, 1905 // Podlaska Digital Library [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pbc.biaman.pl/ dlibra/docmetadata?id=3659&dirds=1&tab=1. – Дата доступа: 15.02.2012.
10. Załęski, S. Jezuici w Polsce : w skróceniu, 5 tomów w jednym, z dwoma mapami / S. Załęski. – Kraków: W.L. Anczyc i Sp., 1908 // Lower Silesian Digital Library [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.dbc.wroc.pl/dlibra/docmetadata?id=3142&from=publication. – Дата доступа: 15.02.2012.

*Паступіў 28.02.2012*

## TEACHING OF LAW SCIENCES IN THE JESUIT EDUCATIONAL INSTITUTIONS IN THE POLOTSK

***D. SHCHERBIK***

*The article examines the history and foundation of Jesuit educational institutions in the Polotsk land, from their appearance in the Commonwealth at the time of Stefan Batory in the XVI century and ending with the elimination of the Russian Empire during the reign of Alexander I in the XIX century. History of «Society of Jesus» teaching is seen from the perspective of the teaching of Law: studied law lecture notes and related disciplines in the Polotsk Jesuit College, and then Polotsk Jesuit Academy, listed law professors, books on legal subjects, the teaching methods of political and legal knowledge. The article gives the results of the Academy: the number of students who studied law, the number of persons who have been awarded the academic degree of doctor in law.*